82.3(4Беи)
К18

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ

ДЗЯРЖАЎНАЯ НАВУКОВАЯ УСТАНОВА
“ІНСТЫТУТ МАСТАЦТВАЗНАЎСТВА, ЭТНАГРАФІІ
І ФАЛЬКЛОРУ ІМЯ К. КРАПІВЫ
НАЦЫЯНАЛЬНАЙ АКАДЭМІІ НАВУК БЕЛАРУСІ”

УДК 398.24:398.432(=826)

**КАМАРОВА Марына Анатольеўна**

# АРХЕТЫПІЧНАСЦЬ, АСАБЛІВАСЦІ СЕМАНТЫКІ І ФУНКЦЫЯНАВАННЯ АРНІТАМОРФНЫХ ВОБРАЗАЎ-СІМВАЛАЎ У БЕЛАРУСКІМ ФАЛЬКЛОРЫ

10.01.09 – фалькларыстыка

Навукова-
бібліяграфічны
аддзел

**АЎТАРЭФЕРАТ**
дысертацыі на атрыманне вучонай ступені
кандыдата філалагічных навук

Установа адукацыі
“Віцебскі дзяржаўны універсітэт
імя П.М. Машэрава”
БІБЛІЯТЭКА

Мінск – 2006

82.3(4Бей)
К18

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ

ДЗЯРЖАЎНАЯ НАВУКОВАЯ ЎСТАНОВА
"ІНСТЫТУТ МАСТАЦТВАЗНАЎСТВА, ЭТНАГРАФІІ
І ФАЛЬКЛОРУ ІМЯ К. КРАПІВЫ
НАЦЫЯНАЛЬНАЙ АКАДЭМІІ НАВУК БЕЛАРУСІ"

УДК 398.24:398.432(=826)

**КАМАРОВА Марына Анатольеўна**

# АРХЕТЫПІЧНАСЦЬ, АСАБЛІВАСЦІ СЕМАНТЫКІ І ФУНКЦЫЯНАВАННЯ АРНІТАМОРФНЫХ ВОБРАЗАЎ-СІМВАЛАЎ У БЕЛАРУСКІМ ФАЛЬКЛОРЫ

10.01.09 – фальклярыстыка

Навукова-
бібліяграфічны
аддзел

АЎТАРЭФЕРАТ
дысертацыі на атрыманне вучонай ступені
кандыдата філалагічных навук

Установа адукацыі
"Віцебскі дзяржаўны універсітэт
імя П. М. Машэрава"
БІБЛІЯТЭКА

Мінск – 2006

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ

4. вызначыць асаблівасці ўяўленняў, звязаных з птушкамі, і прасачыць іх міфапаэтычныя дамінанты ў абрадах, паэтычных і празаічных жанрах традыцыйнага фальклору;

5. вылучыць сістэму нацыянальна-культурных канатацый арнітаморфных вобразаў у беларускай вуснапаэтычнай творчасці,

6. ідэнтыфікаваць функцыянальна-семіятычныя асновы арнітаморфных вобразаў-сімвалаў у агульнаславянскім і індаеўрапейскім кантэкстах.

**Аб'ект і прадмет даследавання.** Аб'ектам даследавання з'яўляецца разнажанравы комплекс беларускага традыцыйнага фальклору: абрадавыя і пазаабрадавыя песні, прыкметы і павер'і, замовы, казкі, балады, легенды, прыказкі і прымаўкі з арнітаморфнымі матывамі; прадметам – асаблівасці ўзнікнення, бытавання і развіцця вобразаў-сімвалаў птушак, а таксама ўяўленняў, звязаных з імі.

**Гіпотэза.** Семантыка і функцыянальнасць, амбівалентнасць, сінкрэтызм і ўстойлівасць арнітаморфных вобразаў у культурнай традыцыі беларусаў указваюць на іх архетыпічнасць. Міфапаэтыка арнітавобразаў вынікае з уяўленняў пра птушку як медыятара паміж рознымі часткамі Космасу, а таксама паміж Космасам і Хаосам, тым і гэтым светам. Універсальная (уласцівая для культурных традыцый іншых народаў) і адметная патэнтыка сімвалічна-вобразнай сістэмы птушак у беларускім фальклоры звязана з рэлевантнымі праявамі адпаведных архетыпаў, што абумоўлена гістарычнымі, сацыяльнымі і побытавымі ўмовамі развіцця этнасу.

**Метадалогія і метады праведзенага даследавання.** Пры аналізе прадмета даследавання прымаецца да ўвагі культуралагічная тэорыя архетыпа, а таксама асаблівасці яго інтэрпрэтацыі ў фальклярыстыцы. Тэарэтычнай і метадалагічнай асновай праведзенага даследавання сталі прынцыпы аб'ектыўнасці і навуковасці, сістэмна-гістарычны і комплексна-міфалагічны падыходы, якія ўключаюць у сябе структурна-тыпалагічны і параўнальна-гістарычны метады. У даследаванні выкарыстоўваліся сінхранічны і дыяхранічны аналіз матэрыялу. Спалучэнне абодвух метадаў звязана з неабходнасцю прасачыць асаблівасці інтэрпрэтацыі занатаванага ў падсістэмах асобных жанраў архетыпічнага зместу і функцыянальнасці арнітаморфных вобразаў-сімвалаў у розных пластах гістарычнай памяці. Пры гэтым падчас аналізу спалучаліся прынцыпы семасіялогіі (апісанне ад формы да зместу) і анамасіялогіі (апісанне ад зместу да формы). Комплексны падыход да вырашэння пастаўленых задач рэалізуецца праз вывучэнне семантыкі і функцыянальнай прызначанасці вобразаў-сімвалаў птушак, аналіз якіх праводзіцца на аснове сінтэзу міфапаэтычных, этнаграфічных і фальклорных дадзеных у супастаўленні з аналагічнымі фальклорнымі творамі іншых народаў без уліку іх жанравай прыналежнасці.

**Навуковая навізна і значнасць атрыманых вынікаў** заключаецца ў тым, што ў дысертацыі сістэмна прадстаўлены і прааналізаваны арнітаморфныя вобразы-сімвалы з пазіцыі іх архетыпічнай змястоўнасці і функцыянальнай накіраванасці ў розных жанрах на аснове семіятычнага аналізу фальклорных тэкстаў, з улікам абагульнення міфалагічных характарыстык. Удакладнена месца вобразаў-сімвалаў птушак у духоўнай спадчыне беларусаў, ідэнтыфікавана ўзаемасувязь і ўзаемадзеянне арнітаморфных уяўленняў з іншымі элементамі цэласнай карціны свету беларусаў.

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ

**Практычная значнасць атрыманых вынікаў.**

Высновы і матэрыялы дысертацыі могуць быць выкарыстаны: 1) пры далейшай распрацоўцы пытанняў і праблем тэорыі архетыпаў; 2) у педагагічнай дзейнасці пры выкладанні курсаў "Славянская міфалогія", "Беларускі фальклор", спецкурсаў і семінараў па духоўнай культуры, этнаграфіі ў вышэйшых навучальных установах; 3) на факультатыўных занятках у сярэдніх навучальных установах, паколькі прадстаўлены матэрыял фарміруе ў навучэнцаў цікавасць да духоўнай спадчыны продкаў. Акрамя таго, праца можа быць выкарыстана ў якасці даведніка па семантыцы арнітаморфных вобразаў-сімвалаў у традыцыйнай культуры беларусаў.

**Асноўныя палажэнні дысертацыі, якія выносяцца на абарону.**

1. Фарміраванне асноў традыцыйнай духоўнай культуры адбываецца ў выніку актуалізацыі або "разгортвання" архетыпаў у канкрэтныя вобразы і сімвалы. Наяўнасць тыповых і адметных рыс традыцыйнай духоўнай культуры этнасу залежыць ад адэкватнага праяўлення архетыпічнасці, якое звязана з гістарычнымі і сацыяльнымі рэаліямі жыцця.

2. Арнітасімволіка традыцыйнай беларускай вуснапаэтычнай творчасці вызначаецца цэласнасцю, варыятыўнасцю, амбівалентнасцю, абумоўлівае адначасова універсальнасць і самабытнасць беларускай традыцыі, што дазваляе ідэнтыфікаваць яе як арганічную канстанту духоўнай культуры беларусаў.

3. З'яўляючыся ўстойлівымі элементамі сімвалічна-вобразнай сістэмы беларускага традыцыйнага фальклору, арнітаморфныя вобразы-сімвалы характарызуюцца глыбокай архетыпічнасцю, на глебе якой развіваецца іх полісемантычнасць, поліфункцыянальнасць і сімволіка, пры гэтым у аснову сімвалізацыі пакладзены актуальныя для носьбітаў культуры прыметы, уласцівасці і атрыбуты.

4. Асобныя семантычныя характарыстыкі вобразаў птушак, міфалагем *Сусветнага яйка*, *Сусветнага дрэва*, *выраю*, *птушкі-душы*, а таксама ўласцівыя для беларускай традыцыі ўяўленні, звязаныя з арнітаморфнасцю, дэтэрмінуюць асаблівасці творчага самавыяўлення народа, ствараюць пэўную сістэмнасць у светаўспрыманні і ўяўляюць сабой адэкватны варыянт адпаведнасці формы і зместу.

5. Міфасемантыка вобразаў-сімвалаў птушак у беларускім фальклоры адлюстроўвае як іх агульную функцыянальную сінкрэтыку, так і індывідуальную патэнтыку, звязаную з асаблівасцямі інтэрпрэтацыі асобных светапоглядных арыенціраў у канкрэтных фальклорных жанрах згодна з ідэйна-мастацкім прызначэннем твораў.

6. Рэпрэзентацыя асобнымі арнітаморфнымі вобразамі-сімваламі аднолькавых семіятычных характарыстык грунтуецца на агульным паняцці арнітаморфнасці, а іх эксклюзіўная патэнтыка залежыць ад самабытнасці ўяўленняў пэўнага этнасу, прычым адзначаныя феномены могуць праяўляцца ў розных ступенях выразнасці ў межах адной традыцыйнай сістэмы або дэтэрмінаваць структурна-генетычныя сувязі паміж традыцыямі розных супольнасцей.

**Асабісты ўклад дысертанта**. Дысертацыйная работа з'яўляецца навуковым даследаваннем, усе палажэнні якога распрацаваны суіскальнікам самастойна на працягу трох этапаў даследавання: тэарэтычнага асэнсавання паняцця "архетып" у гуманітарных навуках; пошуку, адбору і аналізу фактычнага матэрыялу; вырашэння канкрэтных задач даследавання па выяўленню заканамернасцей існавання арнітаморфных вобразаў у творах традыцыйнага беларускага фальклору. Фактычны матэрыял па тэме даследавання

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ
зафіксаваны ў базе дадзеных лексем-арнітонімаў, створанай на аснове СКБД Microsoft Access.

**Апрабацыя вынікаў дысертацыі**. Асноўныя палажэнні і вынікі даследавання дакладваліся і абмяркоўваліся на 8 міжнародных і 1 рэспубліканскай канферэнцыях: 1) Творчасць А. Куляшова і адукацыйна-асветніцкія праблемы сучаснасці (Магілёў, 2002); 2) Творчая спадчына Я. Коласа ў кантэксце сучаснага літаратурнага працэсу (Мінск, 2002); 3) Я. Купала і Я. Колас у кантэксце славянскіх літаратур (Мінск, 2003); 4) Беларуска-польскае супастаўляльнае мовазнаўства, літаратуразнаўства, культуралогія (Віцебск, 2003); 5) Менталитет славян и интеграционные процессы: история, теория, современность, перспективы (Гомель, 2003); 6) История и культура Европы в контексте становления и развития региональных цивилизаций и культур: актуальные проблемы из исторического прошлого и современности (Витебск, 2003); 7) IV Міжнародныя навуковыя Доўнараўскія чытанні (Гомель, 2003); 8) Купаловские чтения (Гродна, 2003); 9) Міжнародная канферэнцыя «Я не самотны, я кнігу маю…», прысвечаная 90-годдзю адзінага прыжыццёвага зборніка вершаў М. Багдановіча «Вянок» (Мінск, 2004).

Дысертацыя абмеркавана на пасяджэннях кафедры грамадскіх дысцыплін Бабруйскага філіяла БДЭУ і аддзела фалькларыстыкі Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы НАН Беларусі.

**Апублікаванасць вынікаў.** Матэрыялы даследавання знайшлі адлюстраванне ў 13 публікацыях аўтара, сярод якіх 4 – у навуковых часопісах, 1 артыкул у зборніку навуковых прац, 8 артыкулаў і тэзісаў дакладаў – у зборніках артыкулаў і матэрыялаў навуковых канферэнцый. Агульны аб’ём публікацый – 55 старонак.

**Структура і аб’ём дысертацыі.** Агульны аб’ём работы складае 157 старонак, з іх 100 старонак займае асноўны тэкст, які ўключае ўводзіны, агульную характарыстыку работы, тры раздзелы з асобнымі параграфамі і заключэнне. Спіс крыніц, выкарыстаных пры напісанні работы, уключае ў сябе 263 назвы. 43 старонкі займаюць дадаткі, у якіх змешчаны прыкметы і павер'і, сюжэты і матывы замоў, казак, легендаў, каляндарна-абрадавых песень, звязаныя з арнітаморфнымі вобразамі.

## АСНОЎНЫ ЗМЕСТ РАБОТЫ

Ва **“Уводзінах”** акрэсліваецца роля і месца арнітаморфнай сімвалічна-вобразнай сістэмы ў традыцыйнай культуры беларусаў, аналізуюцца асноўныя напрамкі вывучэння феномена ў працах айчынных даследчыкаў, абгрунтоўваецца выбар і актуальнасць праблемы даследавання, а таксама асноўныя метадалагічныя падыходы да вырашэння пастаўленай мэты і задач, выкладаюцца асноўныя канцэптуальныя палажэнні працы.

**Першы раздзел “Паняцце “архетып” і яго асэнсаванне ў гуманітарных навуках”** мае агульнатэарэтычны характар. У ім аналізуюцца канцэпцыі розных даследчыкаў адносна разумення феномена архетыпа ў псіхалагічным, філасофскім, культуралагічным аспектах, разглядаюцца тэарэтычныя палажэнні К.-Г.Юнга, І.Канта, Г.Когена, А.Шапэнгауэра, П. Брайля, С. Сендэровіча.

Дысертант заўважае, што архетып уяўляе сабой шматаспектнае паняцце, што выклікана яго апрыорнасцю, універсальнасцю і пэўнай гіпатэтычнасцю. Яго сутнасць складаюць першавобразы, “тэарэтычныя мадэлі”, “каранёвыя паняцці” або “прыроджаныя ідэі”. Архетыпам належыць асобная роля ў акумуляванні і перадачы з пакалення ў пакаленне

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ


калектыўнага вопыту, увасобленага ў якасці "калектыўнага бессвядомага" ў канкрэтных вобразах і сімвалах. Змест архетыпаў стварае тое тыповае ў культуры, што робіць яе трансперсанальнай прыналежнасцю ўсяго чалавецтва. Пры гэтым прадугледжваюцца універсальны і этнакультурны ўзроўні паняцця. Згодна з гэтым, у розных культурах дамінуюць свае асобныя этнакультурныя архетыпы. Менавіта яны вызначаюць асаблівасці нацыянальнага светапогляду і ментальнасці.

У прапанаванай працы архетып разглядаецца як культуралагічны феномен, семіятычная рэальнасць культуры, спецыфічная разумовая структура, у якой змяшчаецца мноства сімвалічных і вобразных рэалій, сфарміраваных на аснове дасягненняў агульных культурных традыцый чалавецтва ці асобнага этнасу.

Не выпадкова, даследуючы старажытнейшыя светапогляды, Д.Шэпінг, І.Снегіроў, А.Весялоўскі, У.Проп, А.Афанасьеў, Ф.Буслаеў, А.Патабня, М.Доўнар-Запольскі і інш. у свой час адзначалі асобную ролю ў іх адзіных па сутнасці фундаментальных агульначалавечых матываў і "пачатковых схем" вераванняў.

Тэрмінам "архетып" шырока карыстаюцца сучасныя даследчыкі традыцыйнай вуснапаэтычнай творчасці Е.Меляцінскі, У.Тапароў, Вяч.Іванаў, А.Тапаркоў, У.Конан, Т.Шамякіна, А.Ненадавец, І.Казакова, І.Чарота, А.Смолік і інш. У сваіх працах даследчыкі падкрэсліваюць, што спасціжэнне архетыпаў абмяжоўваецца тлумачэннем сімвалаў і знешніх вобразаў, перш за ўсё міфічных і фальклорных, праз якія архетыпы актуалізуюцца.

У рабоце асэнсоўваецца суаднесенасць архетыпаў з паняццямі *"міф"*, *"сімвал"*, *"вобраз"* і адзначаецца асаблівая роля фалькларыстыкі пры даследаванні архетыпаў, што вынікае з перавагі калектыўнага, а не індывідуальнага ў вуснапаэтычных творах.

Асэнсаванне "*першасных элементарных форм думкі*", якімі з'яўляюцца архетыпы, носіць у фальклоры некалькі гіпатэтычны характар. Пры гэтым шляхам супастаўляльнага аналізу з вобразна-сюжэтнай сістэмай вуснапаэтычных крыніц розных народаў магчыма рэканструкцыя і на яе аснове вылучэнне пэўных характарыстык архетыпа.

Архетыпы закладзены ў канкрэтных міфічных і фальклорных сюжэтах, матывах і вобразах. Архаічныя культы, рытуалы, абрады і звычаі сваім неад'емным элементам маюць архетыпічнасць.

**Другі раздзел "Арнітаморфныя вобразы беларускага фальклору ў кантэксце архетыпічнасці"** складаецца з 13 параграфаў. Раздзел прысвячаецца вывучэнню архетыпічнай змястоўнасці старажытнабеларускіх уяўленняў, звязаных з арнітаморфнасцю. Ідэі, якія перадаваліся з пакалення ў пакаленне з выкарыстаннем вобразаў птушак, надзвычай разнастайныя. Вобразы птушак выкарыстоўваліся ў якасці міфапаэтычных сімвалаў *боскасці, прыродных стыхій і аб'ектаў, волі, жыцця, абнаўлення*. В.Барэйка, В.Грышчанка, Т.Бернштам, В.Дзёмін выказваюць нават думкі аб панаванні гэтых жывых істот над іншымі ў іерархіі міфічных вобразаў славянскай традыцыі.

Неаднаразова адзначалася прысутнасць выяў птушак на традыцыйных вышыўках, амулетах і абярэгах, а таксама на побытавым посудзе старажытных славян.

Сістэма арнітаморфных вобразаў вылучаецца адметнымі функцыянальнымі характарыстыкамі, асновай якіх з'яўляюцца міфалагічныя ўяўленні адносна птушак як *першатворцаў, дэміургаў, культурных герояў, трыкстэраў, медыятараў, душ.*

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ


жыцця, адэкватных гістарычнаму часу цяжкіх ўмоў сялянскага побыту, нешчаслівая доля, непрадказальны лёс, а таксама розны сацыяльны статус членаў грамадства. Праз арнітаморфныя вобразы "кадзіруюцца" сацыяльныя адносіны (мужчына-жанчына, муж-жонка, бацькі-дзеці і г.д.) [5; 12].

6. Арнітаморфным вобразам-сімвалам у беларускім фальклоры ўласцівы базавыя або універсальныя функцыянальныя характарыстыкі, якія выяўляюцца ў традыцыях іншых народаў (першынство *арла і сокала* ў птушынай іерархіі, культ асобных птушак і г.д.). Ізаморфная семантыка арнітаморфных вобразаў-сімвалаў непасрэдна залежыць ад іх архетыпічнай змястоўнасці і вызначаецца праз старажытныя уяўленні і вераванні – анімізм, фетышызм, татэмізм [3; 10]. Сведчаннем гэтага трэба лічыць успрыманне птушак як боствуў-стваральнікаў Сусвету, апекунамі чалавека і яго лёсу [3]. Падобныя светапоглядныя асновы спрыялі ўзнікненню перакананняў адносна пераносаў птушкамі душы памерлага ў Вырай, вяртання душы на зямлю ў выглядзе птушкі, пераходу душы з птушкі ў дзіця пры нараджэнні, існавання душы жывога чалавека ў птушыным абліччы, магчымасці ператварэння чалавека ў птушку і наадварот. Праз арнітавобразы сімвалічна забяспечвалася сувязь чалавека з продкамі, працяг чалавечага роду. Пазней усялякае мінальнае становішча чалавека (заключэнне шлюбу, рэкруцтва, смерць і г.д.) успрымалася як пераадоленне гэтай мяжы і здзяйснялася з удзелам птушак [4]. Падобныя погляды заўважаюцца ў традыцыях розных этнасаў, аднак праяўляюцца ў іх з большай ці меншай інтэнсіўнасцю.

Арнітаморфныя персанажы вызначаюцца сваёй індывідуальнай патэнтыкай, звязанай з асаблівасцямі інтэрпрэтацыі асобных вобразаў у фальклорнай традыцыі. Эксклюзіўныя (уласцівыя толькі аднаму вобразу-сімвалу) сэнсавыя характарыстыкі могуць належаць да самабытных рэалій беларускай ці славянскай традыцыі (*Жар-птушка*, арнітаморфнае печыва, *зязюля*-нявеста, *воран*-лекар) або ўваходзіць у склад агульнага для розных этнасаў семантычнага поля (*сокал*-жаніх, міфічнае ператварэнне чалавек-птушка і наадварот і т.п.) [1; 2; 6; 11; 12]. Індывідуальныя адметнасці вобразаў-сімвалаў птушак залежаць ад прыродных асаблівасцей іх існавання і ад калектыўнай інтэрпрэтацыі з'яў і аб'ектаў рэчаіснасці, разглядаемых праз прызму светапоглядных асноў [5]. Комплекс уяўленняў пра птушак пераасэнсоўваўся, структураваўся, мадэляваўся чалавечай свядомасцю ў адпаведнасці са зменамі сацыяльных абставін і гістарычных умоў і ўвасабляўся ў канкрэтныя фальклорныя вобразы [1; 3]. Адной са значных прычын звароту да тых ці іншых вобразаў птушак з'яўляецца неабходнасць рэлевантна адлюстраваць канкрэтную сітуацыю.

## СПІС АПУБЛІКАВАНЫХ ПРАЦ ПА ТЭМЕ ДЫСЕРТАЦЫІ

### Артыкулы ў навуковых часопісах


1. Камарова М.А. Крумкачынае пяро // Беларуская думка. – 2003. – № 12. – С. 181–183.
2. Камарова М.А. Вясна прылятае на крылах // Беларуская думка. – 2004. – №4. – С. 177–180.
3. Камарова М.А. Арнітаморфныя вобразы беларускага традыцыйнага фальклору ў кантэксце архетыпічных вераванняў // Вестник Брестского государственного технического университета. – 2004. – № 6. Серия гуманитарных наук. – С. 85–88.

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ


4. Камарова М.А. Міфалагема “птушка-душа” ў светапоглядзе старажытных беларусаў // Веснік БДЭУ. – 2005. – № 1. – С. 97–101.

**Артыкулы ў навуковых зборніках**

5. Камарова М.А. Арнітаморфны архетып і беларускае традыцыйнае вяселле ў распрацоўцы М. Доўнар-Запольскага // IV Міжнарод. Доўнараўскія чытанні (г. Рэчыца, 18-19 верасня 2003г.): У 2 ч. – Ч.1: М.В. Доўнар-Запольскі: жыццё і навуковая спадчына / Рэд. кал.: В.М. Лебедзева (адк. рэд.) і інш. – Гомель: УА “ГДУ імя Ф. Скарыны”, 2004. – С. 79–89.

**Матэрыялы і тэзісы канферэнцый**

6. Камарова М.А. Вобраз-сімвал зязюлі ў творчасці А.Куляшова // Матэр. Міжнар. навук. канф. “Творчасць А. Куляшова і адукацыйна-асветніцкія праблемы сучаснасці”, 6–7 лютага 2002 г. – Магілёў: Выд-ва МДУ імя А. Куляшова, 2002. – С. 83–85.
7. Камарова М.А. Вобраз-сімвал прарочай птушкі ў ранніх творах Янкі Купалы // Я.Купала і Я.Колас у кантэксце славянскіх літаратур: Матэрыялы Міжнар. навук.-тэарэтыч. канф. (Мінск, 3–4 кастрычніка 2002 г.). – Мн.: Бел. навука, 2002. – С. 93–97.
8. Камарова М.А. Арнітаморфны вобраз у паэме Я.Коласа “Сымон-музыка” // Матэр. Міжнарод. навук. канф. “Творчая спадчына Я. Коласа ў кантэксце сучаснага літаратурнага працэсу”. – Мінск, 2003. – С. 222 – 227.
9. Камарова М.А. Сімволіка арла і сокала ў беларускім фальклоры і ў ранніх творах Я. Купалы // Рэспубліканскія Купалаўскія чытанні: Матэрыялы навук. канф., 24 кастр. 2003 г., Гродна / Пад рэд. У.І. Каялы. – Гродна: ГрДУ, 2003. – С. 15–20.
10. Камарова М.А. Арнітаморфны першавобраз ва ўсходнеславянскім абрадзе “Закліканне вясны” // Беларуска-польскае супастаўляльнае мовазнаўства, літаратуразнаўства, культуралогія: Матэр. VI Міжнарод. навук. канф. Ч. II / Пад агульн. рэд. Л.М. Вардамацкага, Г.М. Мезенкі. 15–17 мая 2003 г. – Віцебск: Выд-ва УА “ВДУ імя П.М. Машэрава”, 2003. – С. 189–191.
11. Камарова М.А. Светапоглядныя абсягі старажытных беларусаў у святле арнітаморфнага архетыпа і ідэі светастварэння // История и культура Европы в контексте становления и развития региональных цивилизаций и культур: актуальные проблемы из исторического прошлого и современности. Материалы междунар. науч.-теоретич. конф., 30–31 октября 2003 г. – Витебск: Изд-во УО «ВГУ им. П.М. Машерова», 2003. – С. 82–84.
12. Камарова М.А. Аспект славянскага менталітэту ў міфалагеме “зязюля”: вытокі і асаблівасці (на матэрыяле традыцыйных балад) // Матер. III Междунар. науч. конф. «Менталитет славян и интеграционные процессы: история, теория, современность, перспективы». – Гомель: ГГТУ им. П.О. Сухого, 2003. – С. 192–193.
13. Камарова М.А. Увасабленне міфічнага вобраза птушкі ў творы М.Багдановіча “Страцім-лебедзь” // Зборнік дакладаў: Матэрыялы дакладаў і паведамленняў Міжнарод. навук.-практыч. канф. (2003 г.) «Я не самотны, я кнігу маю…» / Літаратурны музей М. Багдановіча; Склад. Т.Р. Шубіна, І.В. Мышкавец. – Мн., 2004. – С. 70–73.

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ



## РЭЗЮМЭ

**Камарова Марына Антольеўна**

**Архетыпічнасць, асаблівасці семантыкі і функцыянавання арнітаморфных вобразаў-сімвалаў у беларускім фальклоры**

**Ключавыя словы:** архетыпічнасць, архаічныя ўяўленні, арнітаморфны вобраз-сімвал, семантыка, функцыянальная характарыстыка, медыятыўнасць.

**Аб'ект даследавання –** разнажанравы комплекс беларускага традыцыйнага фальклору з арнітаморфнымі матывамі;

**Прадмет даследавання –** асаблівасці ўзнікнення, бытавання і развіцця вобразаў-сімвалаў птушак, а таксама ўяўленняў, звязаных з імі.

**Мэтай работы** з'яўляецца рэканструкцыя архетыпічнага зместу арнітаморфных вобразаў-сімвалаў беларускага фальклору і вызначэнне асаблівасцей іх семантыкі і функцыянавання ў традыцыйных вуснапаэтычных творах.

**Метад даследавання:** структурна-тыпалагічны, параўнальна-гістарычны метады.

**Атрыманыя вынікі і іх навуковая навізна** заключаецца ў сістэмным аналізе арнітаморфных вобразаў-сімвалаў з пазіцыі іх архетыпічнай змястоўнасці і адметнасцей функцыянавання на аснове сінтэзу міфапаэтычных, этнаграфічных і фальклорных дадзеных, у супастаўленні з падобнымі крыніцамі з культурных традыцый іншых народаў.

У выніку праведзеных даследаванняў былі зроблены наступныя высновы: 1) Інтэрпрэтацыя архетыпаў у фалькларыстыцы зыходзіць з асэнсавання канкрэтных міфапаэтычных сімвалаў і вобразаў. Ад рэлевантнага праяўлення архетыпаў залежыць наяўнасць універсальных і аўтэнтычных рысаў традыцыйнай духоўнай культуры этнасу. 2) Арнітаморфныя вобразы характарызуюцца ў беларускім фальклоры глыбокай архетыпічнасцю, адлюстроўваюць старажытнае светасузіранне. 3) Семантыка і функцыянальнасць дазваляюць ідэнтыфікаваць іх як арганічную канстанту духоўнай культуры беларусаў. 4) Міфапаэтыка вобразаў птушак адлюстроўвае іх агульную функцыянальную сінкрэтыку, якая будуецца на ідэі пасярэдніцтва птушкі паміж рознымі часткамі Космасу, а таксама паміж Космасам і Хаосам, тым і гэтым светамі. 5) Вобразам птушак у беларускім фальклоры ўласцівы базавыя функцыянальныя характарыстыкі, якія назіраюцца ў традыцыях іншых народаў. 6) Арнітаморфныя персанажы вызначаюцца сваёй індывідуальнай патэнтыкай, звязанай з асаблівасцямі інтэрпрэтацыі асобных вобразаў у традыцыі. Эксклюзіўныя сэнсавыя характарыстыкі могуць належаць да самабытных рэалій беларускай ці славянскай традыцыі або ўваходзіць у склад агульнага для розных этнасаў семантычнага кола.

Высновы і матэрыялы дысертацыі могуць быць выкарыстаны пры далейшай навуковай распрацоўцы тэорыі архетыпаў; у педагагічнай дзейнасці пры выкладанні курсаў "Славянская міфалогія", "Беларускі фальклор", спецкурсаў і семінараў па духоўнай культуры, этнаграфіі ў вышэйшых навучальных установах; на факультатыўных занятках у сярэдніх навучальных установах. На падставе матэрыялаў даследавання магчыма распрацоўка даведніка па семантыцы арнітаморфных вобразаў-сімвалаў у традыцыйнай культуры беларусаў.

**Галіна выкарыстання:** культуралогія, міфалогія, фалькларыстыка.

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ




## РЕЗЮМЕ

**Комарова Марина Анатольевна**

**Архетипичность, особенности семантики и функционирования орнитоморфных образов-символов в белорусском фольклоре**

**Ключевые слова:** архетипичность, архаические представления, орнитоморфный образ-символ, семантика, функциональная характеристика, медиативность.

**Объект исследования** – разножанровый комплекс белорусского традиционного фольклора с орнитоморфными мотивами;

**Предмет исследования** – особенности возникновения, бытования и развития образов-символов птиц, а также представлений, связанных с ними.

**Целью работы** является реконструкция архетипического содержания орнитоморфных образов-символов белорусского фольклора и определение особенностей их семантики и функционирования в традиционных устно-поэтических произведениях.

**Метод исследования:** структурно-типологический, сравнительно-исторический методы.

**Полученные результаты и их научная новизна** заключается в системном анализе орнитоморфных образов-символов с позиции их архетипической содержательности и особенностей на основе синтеза мифопоэтических, этнографических и фольклорных данных, в сопоставлении с подобными источниками из культурных традиций других народов.

В результате проведенных исследований были сделаны следующие выводы: 1) Интерпретация архетипов в фольклористике исходит из осмысления конкретных мифопоэтических символов и образов. От релевантного проявления архетипов зависит наличие универсальных и аутентичных черт традиционной духовной культуры этноса. 2) Орнитоморфные образы характеризуются в белорусском фольклоре глубокой архетипичностью и отражают древнее мировоззрение. 3) Выразительный полисемантизм и полифункциональность позволяют идентифицировать их как органическую константу духовной культуры белорусов. 4) Мифопоэтика образов птиц отражает их общую функциональную синкретику, которая строится на медиативности птицы между разными частями Космоса, тем и этим мирами. 5) Образам птиц в белорусском фольклоре свойственны базовые функциональные характеристики, которые наблюдаются и в традициях других народов. 6) Орнитоморфные персонажи выделяются своей индивидуальной потентикой, связанной с особенностями интерпретации отдельных образов в традиции. Эксклюзивные смысловые характеристики могут принадлежать самобытным реалиям белорусской или славянской традиции или входить в состав общего для различных этносов семантического круга.

Выводы и материалы диссертации могут быть использованы при дальнейшей научной разработке теории архетипов; в педагогической деятельности при преподавании курсов “Славянская мифология”, “Белорусский фольклор”, спецкурсов и семинаров по духовной культуре, этнографии в высших учебных заведениях. На основе материалов исследования возможна разработка справочника по семантике орнитоморфных образов-символов в традиционной культуре белорусов.

**Область использования:** культурология, мифология, фольклористика.

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ




## SUMMARY

**Komarova Marina Anatolievna**

**Architypicalness, peculiarities of semantics and of ornitomorphic symbolism functioning in Belarusian folklore.**

**Key words:** architypicalness, archaic imagination, ornitomorphic image-symbol, semantics, functional characteristics, mediativity.

**Object of research** –complex of various genres of traditional Belarusian folklore with ornitomorphic motives;

**Subject of research** peculiarities of origin, existence and development of birds' images-symbols, as well as out world look, related to them.

**Aim of research** is reconstruction of architypical contents of ornitomorphic image-symbols of Belarusian folklore and defining of their semantic and functional peculiarities in traditional oral-poetic works.

**Method of research** structural and typological, comparative-historic methods.

**Results achieved and their scientific novelty** is in systemic analysis of ornitomorphic image-symbols from the view of their archetypical value and peculiarities on the basis of mythopoetic, ethnographic and folk data synthesis, in comparison with the similar source of other nations cultural traditions.

As a result of carried out investigations the following conclusions were made**:** 1) Interpretation of architypes in folklore science comes from comprehension of concrete mythopoetical images and symbols. Universal and authentic features of traditional spiritual culture of the nation depend on the relevant reflection of architypes. 2) Ornitomorphic images are characterized by deep architypicalness and reflect ancient world outlook in Belarusian folklore. 3) Vivid polysemantism and polyfunctionality help to identify them as organic constant of spiritual culture of the Belarusian. 4) Mythopoetics of birds' symbolism reflects their common functional syncretism, based on mediativity of the bird among different parts of Cosmos, this world and that one. 5) Basic functional characteristics are given to the birds' images and that can also be found in traditions of other nations. 6) Ornitomorphic characters are peculiar due to their individual potency which is related to the peculiarities of interpretation of some particular symbols in tradition. Exclusive meaningful characteristics may belong to original realias of Belarusian and Slavic tradition or to be the part of one entity for different ethnos of the semantic circle.

The results and material of the research work may be used in further scientific investigation of architype theory; in pedagogical activity while teaching the course of "Slavic mythology", "Belarusian folklore", special courses and seminars on spiritual culture, ethnography in higher educational establishments. On the basis of the material of this research it's possible to make up an enquiry-book on semantics of ornitomorphic image-symbols in traditional culture of the Belarusian.

**The field of usage:** culturology, mythology, folkloristics.


---


Падпісана да друку 30.05.2006. Фармат 69x84 1/16 Бумага афсетная. Гарнітура Roman.
Друк цыфравы. Ум.др.л. 1,3. Уч.выд.л. 1,4. Тыраж 60 экз. Заказ № 187.
ВТАА «Права і экономіка» Ліцэнзія ЛІ № 02330/0056831 от 01.04.2004.
220072 Мінск Сурганава 1, корп. 2. Тэл. 284 18 66, 8 029 684 18 66.
Надрукавана на настольна-выдавецкай сістэме XEROX ВТАА «Права і эканоміка».